# МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ СКЛОНАВЫХ КАНЧАТКАЎ НАЗОЎНІКАЎ У ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Коўзель Дар’я Мікалаеўна
УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

Асноўная праца над склонавымі формамі назоўніка праводзіцца ў чацвёртым класе. Яе асноўная мэта – навучыць дзяцей правільна выкарыстоўваць іх у моўных зносінах, не дапускаць памылак пры пісьме.

Традыцыйна ў школьнай практыцы спачатку ідзе вывучэнне правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення, затым 2-га і 3-га. Такая паслядоўнасць з’яўляецца найбольш зручнай, бо дае вучням магчымасць зразумець характэрныя асаблівасці змянення назоўнікаў аднаго тыпу скланення, потым другога, трэцяга і, нарэшце, суаднесці формы змянення назоўнікаў розных тыпаў скланення.

Пазнаёміць вучняў са скланеннем назоўнікаў можна на аснове тэксту, у якім адзін і той жа назоўнік ужываецца ва ўсіх склонах. Да яго пастаўлены адпаведныя пытанні. Дзеці заўважаюць, што назоўнік мяняе свае канчаткі, звязваючыся па сэнсе з іншымі словамі ў сказе. Пытанні і склонавыя формы назоўніка запісваюцца ў слупок. Уводзіцца паняцце скланенне (змяненне назоўніка па пытаннях). Вучні запамінаюць назвы склонаў і склонавыя пытанні. Каб лягчэй запомніць назвы склонаў у падручніку даецца тлумачэнне іх паходжання (*назоўны* – называе прадмет; *родны* – паказвае чый прадмет, адкуль *“родам” (*кніга брата, шум лесу)*; давальны* – звязаны з дзеясловам *“даць”* (даць брату); *вінавальны* – звязаны з дзеясловамі “*вінаваціць*”, “*бачыць*” (убачыць сястру, скласці казку); *творны* – паказвае на прадмет, з дапамогай якога выконваецца дзеянне, або на сумеснае дзеянне (касіць касой, касіць з татам); *месны* часта паказвае на *месца* дзеяння (сядзець на дрэве, працаваць на камбайне).

Чацвёртакласнікі спачатку вучацца змяняць назоўнікі па склонах з апорай на ўзор і вызначаць склон назоўніка з дапамогай памяткі, якая змешчана ў падручніку:

*– знайдзі слова, з якім звязаны назоўнік;*

*– ад гэтага слова пастаў склонавае пытанне да назоўніка;*

*– па пытанні вызначы склон назоўніка.*

Звяртаецца ўвага на ўжыванне (адсутнасць) прыназоўнікаў са склонамі.

Пасля гэтага на аснове параўнання склонавых канчаткаў назоўнікаў у трох прыведзеных табліцах вучні даказваюць, на аснове чаго ўсе назоўнікі можна падзяліць на тры групы (скланенні). Далей прыводзіцца памятка, якая дапамагае вызначаць скланенне назоўніка (с. 76):

*– паставіць назоўнік у назоўным склоне адзіночнага ліку;*

*– вызначыць род назоўніка;*

*– вызначыць канчатак назоўніка ў назоўным склоне адз. ліку;*

*– па родзе і канчатку вызначыць скланенне.*

Паколькі вызначаць склон назоўніка вучням даводзіцца часцей за ўсё ў кантэксце, перад настаўнікам стаіць задача навучыць дзяцей ставіць да склонавых формаў назоўніка не толькі фармальна-граматычныя, але і сэнсавыя пытанні (дзе? куды? адкуль?..) Гэта дапаможа потым правільна вызначаць члены сказа, рабіць сінтаксічны разбор.

Вучні павінны ведаць, што склон назоўніка можна вызначыць па сукупнасці прымет:

*– сінтаксічнай ролі ў сказе;*

*– па пытаннях (у тым ліку і па склонавых);*

*– па прыназоўніках.*

У практыцы работы школы назапашаны вялікі вопыт навучання малодшых школьнікаў скланенню назоўнікаў, правапісу канчаткаў. Прывядзем некаторыя практыкаванні.

***Прыём фразавага*** **скланення** (*вусна ставяцца пытанні, абазначаюцца канчаткі)*

*Н.* На ясным вячэрнім небе ўзышла *зорка.*

*Р.* Раптам хмаркі засланілі неба і *зоркі* не стала.

*Д.* Сумна *зорцы.*

*В.* Глянуў на *зорку* месячык, які таксама сумаваў.

*Т.* Ён залюбаваўся *зоркай.*

*М.* А калі яна нечакана згарэла і ўпала, месячык доўга ўспамінаў *аб зорцы.*

**Выкарыстанне звязных тэкстаў, у якім ужываюцца ўсе склонавыя формы аднаго слова**

*Мой сусед – мастак. Мастака не было дома, калі з пошты прынеслі тэлеграму. Гэта было віншаванне мастаку з нагоды адкрыцця выставы. Убачыўшы мастака, я перадаў яму тэлеграму. Усе суседзі зацікавіліся мастаком. Аб мастаку напісалі ў газеце.*

Зразумела, што гэта вучэбны тэкст, які патрабуе ў асобных выпадках замены назоўніка займеннікамі і сінанімічнымі словамі. Паўторна яго можна выкарыстаць пры вывучэнні адпаведных тэм.

**Складанне звязных тэкстаў па загадзя падабраных пытаннях**

*Хто працуе на заводзе? (Мой дзядуля працуе на заводзе).*

*Каго сёння не было на працы? (Дзядулі… )*

*Каму доктар даў бюлетэнь? (Дзядулю… )*

*Каго ты наведаў у выхадны дзень? (Дзядулю … )*

*Кім ты заўсёды ганарышся? (Дзядулем … )*

*Аб кім ты расказаў сёння. (Аб дзядулю … )*

**Камунікатыўнае заданне**

*Вы дама засталіся адны. Мама пайшла ў магазін. Вы зрабілі ўрокі і захацелі пагуляць. Каб мама не турбавалася, вам трэба напісаць запіску. Напішыце запіску. Падкрэсліце назоўнікі і вызначыце іх склон.*

**Вызначце, у якім склоне ўжыты назоўнікі ў прыказках і народных прыметах**

*Многа снегу – многа хлеба.*

*Дым слупом – да марозу.*

*Лес зімой зашумеў – чакай адлігі.*

**Дыдактычная гульня “Кім (чым) былі раней?”**

*Кураня – яйкам, дзень – ноччу, лёд – вадой, мужчына – юнаком, дуб – жолудам; рыба – ікрынкай; генерал – палкоўнікам.*

**Дыдактычная гульня “На чым прыехаў Дед Мароз?”**

Кожная з каманд павінна назваць як мага больш транспартных сродкаў.

*Дзед Мароз прыехаў на трамваі, тралейбусе, аўтобусе, на метро, машыне, санях, веласіпедзе…*

*Дзед Мароз прыплыў на параходзе, на лодцы, на пароме, на яхце, на караблі...*

*Дзед Мароз прыляцеў на самалёце, планеры, паветраным шары, дэльтаплане, ракеце…*

**Дыдактычная гульня “Карэктар”** *(паправіць памылкі ў фразе)*

*Мы бачылі хуткага цягніка.*

*У рыбаў няма зубоў (у рыб няма зуб; у рыбоў няма зубоў).*

Засваенне назоўніка з’яўляецца адной з важных задач вывучэння школьнай граматыкі. Назоўнік у сучаснай беларускай мове валодае багатымі семантычнымі магчымасцямі, граматычнай сістэмай катэгорый і форм, разнастайнымі марфалагічнымі і сінтаксічнымі прыметамі, а таму служыць невычэрпнай крыніцай папаўнення слоўніка вучняў пачатковых класаў, павышэння культуры маўлення. Пры вывучэнні назоўнікаў школьнікі асэнсоўваюць паняцце граматычнай прадметнасці, глыбей знаёмяцца з лексічным значэннем субстантываў, а гэта ў значнай меры садзейнічае развіццю абстрактнага мыслення дзяцей.